# Беларускія народныя песенькі і пацешкі для дзяцей 5 - 6 гадоў

-Сіўка-варонка!
Да-лі-гойда!
Куды паляцела?
-К кавалю на двор.
-Нашто табе каваль?
-Косы кавацць.
-Нашто табе косы?
-Траўку касіці.
-Нашто тая траўка?
-Каровак карміці.
-А нашто кароўкі?
-Млечка даіці.
-А нашто млечка?
-Сырцы ляпіці.
-А нашто сырцы?
-Пастухоў карміці.
-А дзе ж пастухі?
-На вайну пайшлі.
-Дзе тая вайна?
-Пасярод гумна.

---

Ходзіць каток па сяле
Носіць дзіця ў кашале.
Ходзіць каток па капусце,
Носіць дзіця ў белай хустцы.
Дай катка злапалі,
Дзіця адабралі.



---

Сонека-сонца,
Выгляні ў аконца,
Пасвяці нам трошку,
Дам табе гарошку.

---

-Ты каза, каза,
Лубяныя вочы,
Ты каза, ідзе была?
-Я, каза, каней пасла.
-Ідзе коні?

-Ніколка ўкраў.
-Ідзе Ніколка?
-У клецъ пайшоў.
-Ідзе тая клецъ?
-Вадой пазаліло.
-Ідзе вада?
-Быкі выпілі.
-Ідзе быкі?
-Пад гару ушлі.
-Ідзе гара?
-Чэрві вытачылі.
-Ідзе чэрві?
-Гусі паклявалі.
-Ідзе гусі?
-У траснік паплылі.
-Ідзе траснік?
-Дзеўкі паламалі.
-Ідзе дзеўкі?
-Замуж пайшлі.
-Ідзе муж'ё?
-Пайшлі сена касіць.

Бяжыць вожы
Туп-туп!
Сам калючы
Востры зуб.
-Вожык,вожык,
Ты куды?
Ад якой бяжыш
Бяды.
Вожык лапкамі
Туп-туп!
Вожык вочкамі
Луп-луп.
Навокал
Пануе ціш.
Чуе вожык-
У лісці мыш.
Ён да лісця
Тапу-тап!
І лапкаю мышку- Цап!